ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
24.08.2026 № 152

# Вучэбная праграма
# па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет»
# для VI класа першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет» (далей – вучэбная праграма) прызначана для VI класа першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю.

2. Дадзеная вучэбная праграма распрацавана згодна з вучэбным планам першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю з улікам колькасці вучэбных гадзін на тыдзень: у VI класе на яе вывучэнне адведзена 2 гадзіны на тыдзень, 70 гадзін у навучальным годзе (14 гадзін – на адукацыйны кампанент «Чалавек і грамадства», 52 гадзіны – на адукацыйны кампанент «Прырода і чалавек», 4 гадзіны – на адукацыйны кампанент «Чалавек і яго здароўе»).

3. Мэта навучання вучэбнаму прадмету «Чалавек і свет» – развіццё ў вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю жыццёва важных уяўленняў, уменняў, навыкаў, спосабаў практычнай дзейнасці ў сістэме «чалавек – прырода – грамадства», неабходных для паспяховага функцыянавання ў розных сферах жыццядзейнасці.

4. Задачы навучання вучэбнаму прадмету «Чалавек і свет»:

фарміраваць уяўленні аб месцы чалавека ў прыродзе і грамадстве, паняцці аб аб’ектах і з’явах прыроды, іх разнастайнасці, адзінстве прыроднага і сацыяльнага;

фарміраваць уяўленні аб арганізме чалавека, кампанентах здаровага ладу жыцця і спосабах яго рэалізацыі;

развіваць эмацыянальна-каштоўнаснае стаўленне да прыроды, пазнавальную цікавасць да вывучэння аб’ектаў жывой і нежывой прыроды;

фарміраваць вопыт прыродаахоўнай дзейнасці, захавання экалагічна абумоўленых норм паводзін;

пашыраць веды аб нормах і правілах культурападобных паводзін у навакольным сацыяльным асяроддзі, вопыт маральнага стаўлення да людзей;

фарміраваць уменні выконваць пасільную практычную дзейнасць: ставіць мэту работы, складаць план дзеянняў, прадумваць некалькі варыянтаў рашэння праблемнай задачы; выкарыстоўваць дадатковыя крыніцы інфармацыі (ілюстрацыі, схемы і іншыя), неабходныя для работы; публічна расказваць аб выніках праведзенай практычнай работы;

выхоўваць патрыятызм, нацыянальную самасвядомасць, асновы грамадзянскай культуры.

5. Формы і метады рэалізацыі зместу дадзенай вучэбнай праграмы «Чалавек і свет», якія рэкамендуюцца: урокі-падарожжы, урокі-адкрыцці, урокі-асцярожнасці, якія забяспечваюць захаванне і падтрыманне працаздольнасці, здаровага ладу жыцця і бяспекі жыццядзейнасці ў вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Асаблівае значэнне ў засваенні зместу вучэбнага прадмета маюць мэтавыя прагулкі і экскурсіі, якія дазваляюць вучням спазнаваць навакольны свет праз назіранні, вывучаць навакольныя аб’екты з дапамогай органаў пачуццяў, прадстаўляць вынікі пазнання ў выглядзе розных творчых работ, набываць вопыт прыродаахоўных паводзін і дзейнасці. Пры арганізацыі вучэбнай дзейнасці акцэнтуецца ўвага на засваенні спосабаў дзеянняў. Вынікам навучання з’яўляюцца ўменні паспяхова дзейнічаць у жыццёвых сітуацыях на аснове сфарміраваных кампетэнцый.

Прыярытэтныя метады навучання і выхавання: гутаркі, гульнявыя практыкаванні, работа з вучэбным дапаможнікам, рознымі крыніцамі інфармацыі (тэкстамі розных жанраў, малюнкамі, фатаграфіямі, табліцамі, структурна-лагічнымі схемамі, інтэрнэт-крыніцамі), рашэнне сітуацыйных задач; метад адкрытай ацэнкі (адабрэнне, пахвала, узнагароджанне, падзяка), іншыя.

Змест вучэбнай праграмы прадстаўлены трыма ўзаемазвязанымі адукацыйнымі кампанентамі: «Чалавек і грамадства», «Прырода і чалавек», «Чалавек і яго здароўе».

У працэсе асваення зместу адукацыйнага кампанента «Чалавек і грамадства» фарміруюцца ўяўленні вучняў аб значэнні працы ў жыцці гарадскіх і сельскіх жыхароў, аб асновах эканомікі; уменні праяўляць эмацыянальна-каштоўнаснае стаўленне да навакольных, дэманстраваць сацыяльна прымальныя спосабы зносін. Краязнаўчы матэрыял, уключаны ў гэты раздзел вучэбнай праграмы, садзейнічае пашырэнню ўяўленняў аб правах і абавязках грамадзян Рэспублікі Беларусь, неабходнасці выканання законаў; выхаванню патрыятычных пачуццяў, паважлівага стаўлення да людзей і культурных славутасцей краіны, асэнсаванню паняццяў «доўг», «абавязкі і правы чалавека».

Змест адукацыйнага кампанента «Прырода і чалавек» накіраваны на засваенне вучнямі з інтэлектуальнай недастатковасцю ўяўленняў аб гарызонце, старанах гарызонту, практычных спосабах арыентавання, разнастайнасці аб’ектаў навакольнага свету, значэнні вады і паветра ў жыцці чалавека, прыродных багаццях; выхаванне беражлівых адносін да прыродных аб’ектаў і фарміраванне вопыту практычнай прыродаахоўнай дзейнасці.

Адукацыйны кампанент «Чалавек і яго здароўе» спрыяе засваенню практычных дзеянняў па бяспечнай санітарыі, прафілактыцы харчовых атручванняў, прастудных захворванняў і траўматызму.

Віды вучэбнай дзейнасці вучняў вызначаюцца ў залежнасці ад крыніцы атрымання інфармацыі: на аснове практычнай дзейнасці ў працэсе назіранняў за аб’ектамі і з’явамі прыроды, дэманстрацыйнымі доследамі; на слоўнай аснове (расказ настаўніка, тэкст вучэбнага дапаможніка, электронныя адукацыйныя рэсурсы, аўдыё- і відэаматэрыялы).

Пры вывучэнні матэрыялу адукацыйнага кампанента «Чалавек і грамадства» пазнавальныя вучэбныя дзеянні ажыццяўляюцца з дапамогай лагічных аперацый вылучэння прымет аб’ектаў і з’яў, упарадкавання, параўнання і класіфікацыі на аснове істотных прымет, устанаўлення аналогіі, прычынна-выніковых сувязей; аналізу, сінтэзу, вываду, абагульнення, сістэматызацыі. На ўроках вучні аналізуюць сітуацыі штодзённага жыцця, удзельнічаюць у інсцэніроўках, гульнях-драматызацыях, эцюдах; выконваюць практычныя работы (займаюцца добраўпарадкаваннем прышкольнага ўчастка, вырошчваннем і ўборкай ураджаю, даглядаюць жывёлу).

Засваенне вучэбнага матэрыялу адукацыйнага кампанента «Чалавек і прырода» ажыццяўляецца з дапамогай практычных метадаў: назіранняў – кароткачасовых (за прыроднымі аб’ектамі і з’явамі), працяглых (за зменамі ў прыродзе ў розныя поры года); дэманстрацыі – натуральных аб’ектаў, выяўленчай нагляднасці (ілюстрацый, фатаграфій, схем), доследаў (з вадой, паветрам); выканання творчых работ (напрыклад, на тэму бяспечных паводзін пры неспрыяльных прыродных з’явах).

Вывучэнне адукацыйнага кампанента «Чалавек і яго здароўе» забяспечваецца з дапамогай слоўных метадаў (тлумачэння, гутаркі, расказу, вучэбных дыскусій з абмеркаваннем на даступным узроўні экалагічных і санітарна-гігіенічных праблем і шляхоў іх вырашэння), маўленчых лагічных задач (аналіз фактараў захворванняў і траўматызму); практычных метадаў (камплектаванне аптэчкі).

Дзейнасць вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю на ўроку павінна грунтавацца на іх моцных баках развіцця, пачуццёвым вопыце, наглядна-практычнай дзейнасці, прымяненні ведаў у жыццёвых сітуацыях. Пры рэалізацыі дыферэнцыраванага і індывідуальнага падыходаў настаўнік вар’іруе аб’ём і складанасць вучэбнага матэрыялу для розных тыпалагічных груп вучняў, ступень самастойнасці выканання імі вучэбных заданняў, віды дапамогі. Педагог кіруе пазнавальнай дзейнасцю вучняў, дапамагаючы выконваць аналіз, сінтэз, параўнанне і

абагульненне, рабіць неабходныя вывады, заахвочвае расказваць пра выкананыя практычныя або разумовыя дзеянні.

6. Асноўныя патрабаванні да вынікаў засваення зместу вучэбнага матэрыялу.

Вучні ведаюць:

аб прафесіях людзей, значэнні працы ў жыцці чалавека;

ролі вады, паветра, глебы ў жыцці аб'ектаў жывой прыроды;

кампанентах здаровага ладу жыцця і спосабах яго рэалізацыі;

правілах гігіены, этыкету, сацыяльна прымальных паводзін, бяспечнай жыццядзейнасці;

правах і абавязках грамадзян Рэспублікі Беларусь, неабходнасці прытрымлівання законаў дзяржавы;

маюць уяўленне:

аб розных спосабах арыентавання на мясцовасці;

асноўных кампанентах нежывой прыроды;

целах, рэчывах, часціцах, кругавароце вады ў прыродзе, сонечнай сістэме, разнастайнасці карысных выкапняў, іх здабычы, выкарыстанні і ахове;

умеюць:

устанаўліваць шляхам назіранняў паслядоўнасць і прычыннасць прыродных змен;

выяўляць даступныя назіранню і разуменню сувязі і залежнасці ў прыродзе;

выконваць значныя дзеянні па доглядзе раслін і жывёл;

праяўляць эмпатычныя пачуцці ў адносінах да жывых аб'ектаў прыроды;

прытрымлівацца правіл этыкету, праяўляць стрыманасць, не прыцягваць увагу ў грамадскіх месцах;

разумець эмацыянальныя станы людзей, клапаціцца пра іх, праяўляць дружалюбнасць;

выконваць правілы асабістай гігіены, ацэньваць свой знешні выгляд, прыводзіць яго ў адпаведнасць з эстэтычнымі патрабаваннямі;

выконваць рэжым дня;

прытрымлівацца правіл бяспечнай жыццядзейнасці і сацыяльна прымальных паводзін у штодзённым жыцці.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ Ў VI КЛАСЕ.
## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ
(70 гадзін)

# АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ «ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА» (14 гадзін)

## Чалавек-працаўнік (4 гадзіны)

Значэнне працы ў жыцці людзей.

Разнастайнасць прафесій і вынік працоўнай дзейнасці людзей.

Асаблівасці працы гарадскіх і сельскіх жыхароў. Беражлівыя адносіны да вынікаў працы людзей.

Культура працы вучняў.

### Практычная дзейнасць

Назіранні за працоўнай дзейнасцю людзей розных прафесій у гарадской і сельскай мясцовасці (па магчымасці). Экскурсіі на мясцовыя прадпрыемствы (вытворчасць сельскагаспадарчай і прамысловай прадукцыі), выставу гатовай прадукцыі (па магчымасці і меркаванні настаўніка). Выкананне вучнямі пасільных даручэнняў у штодзённым жыцці (самаабслугоўванне, прыбіранне памяшкання, прыгатаванне ежы, сервіроўка стала, догляд прадметаў адзення і абутку). Удзел у добраўпарадкаванні прышкольнага ўчастка, вырошчванні і ўборцы ўраджаю, догляд жывёлы.

## Чалавек сярод людзей (4 гадзіны)

Паняцце пра этыкет.

Этыкет у сям’і, калектыве равеснікаў, грамадскіх месцах: на вуліцы, у транспарце, магазіне, кінатэатры.

Вербальныя і невербальныя спосабы зносін: інтанацыя, міміка, жэсты і іншыя.

### Практычная дзейнасць

Назіранні за паводзінамі людзей, аналіз іх эмоцый і настрою ў розных сацыяльна-бытавых сітуацыях.

Спосабы ўключэння ў зносіны з навакольнымі людзьмі. Адпрацоўка правіл паводзін у грамадскіх месцах з увядзеннем рэальных аб’ектаў камунікацыі.

## Асновы эканоміі (4 гадзіны)

Бюджэт сям’і, яго складальнікі (даходы і расходы). Азбука эканоміі і беражлівасці ў сям’і. Пакупкі неабходныя і неабавязковыя.

### Практычная дзейнасць

Назіранні за дзеяннямі дарослых у магазіне (выбар і аплата тавараў, складванне і раскладванне пакупак). Удзел у працоўных справах класа, школы, сям’і.

Чалавек-грамадзянін (2 гадзіны)

Наша Радзіма – Рэспубліка Беларусь; памятныя і славутыя мясціны Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь (сцяг, герб і гімн).

Мы – грамадзяне Рэспублікі Беларусь: духоўныя і маральныя рысы нацыі. Правы і абавязкі. Дзяржаўнае свята – Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Практычная дзейнасць

Відэаэкскурсія па памятных, славутых мясцінах Рэспублікі Беларусь.

## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ «ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК» (52 гадзіны)

Арыентаванне на мясцовасці (3 гадзіны)

Гарызонт і лінія гарызонту. Асноўныя стораны гарызонту.

Арыентаванне па сонцы і мясцовых прыметах прыроды.

Арыентаванне па компасе.

Практычная дзейнасць

Разгляд гарызонту і лініі гарызонту. Вызначэнне асноўных старон гарызонту па сонцы і компасе. Практыкаванні ў арыентаванні па мясцовых прыметах прыроды. Назіранні за Сонцам як нябесным целам, якое ўплывае на сезонныя змены на Зямлі.

Прыродныя аб’екты і з’явы (4 гадзіны)

Разнастайнасць аб’ектаў навакольнага свету. Прырода вакол нас. Расліны. Жывёлы. Чалавек – частка прыроды.

Цела, рэчывы, часціцы. Цвёрдыя целы, вадкасці і газы. Сумесі рэчываў. Небяспечныя рэчывы і сумесі ў доме: правілы захоўвання і выкарыстання. Папярэджанне няшчасных выпадкаў у побыце.

Прырода жывая і нежывая. Істотныя прыметы жывых арганізмаў. Прырода ў розныя сезоны. Прыродныя з’явы: дождж, навальніца, вецер, лістапад, снегапад і іншыя. Правілы бяспечных паводзін пры неспрыяльных прыродных з’явах (ураганным ветры, ліўні, навальніцы і іншых).

Парушаная чалавекам прырода і магчымасці яе аднаўлення (высяканне лесу – лесапасадкі, забруджванне паветра выхлапнымі газамі транспартных сродкаў – будаўніцтва кальцавых дарог і іншыя прыклады).

Практычная дзейнасць

Практычныя работы і доследы: растварэнне солі (цукру, крухмалу) у вадзе. Устанаўленне доследным шляхам адрозненняў паміж цвёрдым целам, вадкасцю і газам. Складанне правіл захоўвання і выкарыстання ў побыце выбухованебяспечных рэчываў (запальнічак, аэразоляў і іншых).

Вада (9 гадзін)

Вада ў прыродзе. Уласцівасці вады як вадкасці (цякучая, не мае пастаяннай формы; чыстая вада – празрыстая, бясколерная, без паху, прэсная).

Прыродныя з’явы, звязаныя з награваннем і ахаладжэннем вады. Стан вады. Вада ў цвёрдым стане: лёд, снег, іх уласцівасці. Снегазатрыманне. Правілы бяспекі зімой на дарогах, рэках і азёрах.

Выпарэнне вады. Пара – газападобная вада. Уласцівасці пары. Умовы, пры якіх выпарэнне адбываецца хутчэй. Пара на службе ў чалавека. Ператварэнне пары ў ваду. Раса, іней – відазмяненні пары. Туман, аблокі, хмары.

Кругаварот вады ў прыродзе. Змяненні, якія адбываюцца з вадой пры награванні, ахаладжэнні, замарожванні. Улік гэтых уласцівасцей вады ў побыце і гаспадарчай дзейнасці чалавека.

Тэмпература і тэрмометр. Будова і віды тэрмометраў. Вымярэнне тэмпературы вады. Правілы бяспечнага абыходжання з тэрмометрам. Адзінка вымярэння і абазначэнне тэмпературы. Правілы бяспечнага карыстання гарачай вадой.

Вада – растваральнік. Растваральныя і нерастваральныя рэчывы. Растворы ў прыродзе і побыце. Змяненне ўласцівасцей вады пры растварэнні ў ёй рэчываў. Мінеральная і марская вада. Правілы бяспечнага карыстання растворамі. Выкарыстанне вады чалавекам. Эканомнае расходаванне вады. Спосабы ачысткі вады.

Рэкі і азёры Рэспублікі Беларусь. Ахова вадаёмаў ад забруджвання. Правілы бяспечных паводзін каля вадаёмаў.

Практычная дзейнасць

Практычныя работы: вывучэнне ўласцівасцей вады як вадкасці; уласцівасцей лёду і снегу; вымярэнне тэмпературы вады; растварэнне рэчываў у вадзе; ачыстка мутных сумесей спосабамі фільтравання, адстойвання.

Назіранні за выпарэннем вады ў прыродзе і побыце; выпадзеннем ападкаў: дажджу, снегу (граду); ператварэннем вады (кіпенне, раставанне льду, снегу). Абмеркаванне мер, накіраваных на зберажэнне вады дома, у школе.

Дэманстрацыя доследаў: пашырэнне вады пры награванні; сціскание вады пры ахалоджванні; выпарванне раствораў мінеральнай і пітной вады. Кругаварот вады ў прыродзе.

Адпрацоўка спосабаў задавальнення жыццёвых патрэб у вадзе (спаталенне смагі, кіпячэнне вады, прыгатаванне ежы, мыццё бялізны і іншыя). Абмеркаванне спосабаў папярэджання апёкаў гарачай вадой, парай. Абмеркаванне спосабаў эканомнага расходавання пітной вады.

Сонечная сістэма і нябесныя целы (5 гадзін)

Зорнае неба. Зоркі. Адрозненні зорак. Сонца – бліжэйшая да Зямлі зорка. Сузор'і. Сонечная сістэма. Састаў Сонечнай сістэмы. Рух Зямлі вакол Сонца.

Месяц – спадарожнік Зямлі. Бачны рух Месяца, яго асноўныя фазы: маладзік, першая чвэрць, поўня, апошняя чвэрць. Уплыў Месяца на зямныя працэсы (прылівы і адлівы).

Практычная дзейнасць

Знаходжанне зорак і сузор'яў на карце атласа (і/або небасхіле). Замалёўка фаз месяца.

Паветра (8 гадзін)

Паветра вакол нас. Паветра – газападобнае рэчыва. Уласцівасці паветра (займае месца, можна сціснуць, дрэнна праводзіць цяпло). Выкарыстанне ўласцівасцей паветра чалавекам.

Змяненне аб'ёму паветра пры награванні і ахаладжэнні. Цёплае і халоднае паветра. Крыніцы награвання паветра ў прыродзе і побыце. Рух цёплага і халоднага паветра ў прыродзе і памяшканні. Праветрыванне памяшкання.

Паветра – сумесь газаў. Кісларод, яго значэнне. Вуглякіслы газ, напрамкі выкарыстання чалавекам. Прымесі ў паветры. Крыніцы забруджвання паветра. Ахова паветра ад забруджвання.

Вецер, яго значэнне ў прыродзе. Стыхійныя бедствы. Значэнне прагнозаў надвор'я.

Практычная дзейнасць

Практычныя работы: выяўленне паветра ў навакольнай прасторы, цвёрдым целе, вадзе; вызначэнне пругкасці сціснутых цел (спружынкі, гумкі); вымярэнне тэмпературы паветра. Назіранні за рухам пёрка над награвальным прыборам, гарэннем свечкі, дзеяннямі ветру ў прыродзе (разносіць насенне раслін, дапамагае перамяшчэнню птушак), мерамі па ахове паветра ад забруджвання.

Дэманстрацыя доследаў: паветра займае месца; сціснутае паветра валодае пругкасцю (паветраны пісталет); паветра дрэнна праводзіць цяпло; цёплае паветра лягчэйшае, чым халоднае.

Удзел у азеляненні школьнага двара (вуліцы), развядзенні і вырошчванні хатніх раслін. Тлумачэнне і дэманстрацыя спосабаў візуальнага вызначэння сілы ветру ў прыродзе; пералівання вадкасцей у ёмістасці з дапамогай варонкі; вызначэння месц праколаў мяча, веласіпеднай камеры; бяспечнага выкарыстання аэразоляў у побыце; падтрымання паветранага і цеплавога рэжыму ў кватэры (доме); вымярэння тэмпературы паветра.

Глеба – прыроднае багацце (8 гадзін)

Паняцце аб глебе як каштоўным слоі зямлі, яе ролі ў прыродзе і жыцці чалавека. Састаў глебы. Пясок, гліна як часткі глебавага слоя. Наяўнасць вады, паветра ў глебе.

Урадлівасць глебы – умова росту і развіцця раслін. Перагной – крыніца пажыўных рэчываў для раслін. Тыпы глеб, іх уласцівасці. Глебы Беларусі, іх выкарыстанне. Дзейнасць чалавека па паляпшэнні ўласцівасцей глебы. Прыёмы паляпшэння ўласцівасцей глебы. Значэнне глебы і яе ахова.

Яры, іх утварэнне. Меры, якія папярэджваюць утварэнне яроў. Прыёмы апрацоўкі глебы на вялікіх і малых плошчах. Правілы гігіены і тэхнікі бяспекі ў працэсе апрацоўкі глебы.

Практычная дзейнасць

Экскурсія да глебавага агалення (кар’еру, абрыву, яру). Практычныя работы: выраб мадэлі «Верхнія слаі зямлі»; вывучэнне знешняга выгляду і саставу ўзораў розных глеб; апрацоўка глебы: вывучэнне яе саставу, сувязі з раслінамі, паляпшэнне ўласцівасцей.

Дэманстрацыя доследаў: рух вады ў розных тыпах глеб; назіранні за ростам і развіццём раслін на розных глебах; за апрацоўкай глебы на вялікіх плошчах з выкарыстаннем сельскагаспадарчай тэхнікі; за аховай глебавага слоя пры ўзвядзенні будынкаў.

Адпрацоўка спосабаў правільнага паліву раслін, рыхленне глебы. Удзел у апрацоўцы глебы на невялікіх плошчах (перакопка, рыхленне каляствольных колаў дрэў і кустоў). Адпрацоўка спосабаў асцярожнага абыходжання з інструментамі пры апрацоўцы глебы. Вывучэнне спосабаў падрыхтоўкі глебы да пасеву насення і пасадкі раслін (узворванне, баранаванне), спосабаў закладання кампосту. Прытрымліванне правіл гігіены пры рабоце з глебай. Адпрацоўка спосабаў ацэнкі якасці ўласных дзеянняў пры выкананні практычных

работ.

Падземныя багацці (9 гадзін)

Паняцце пра карысныя выкапні, іх разнастайнасць, значэнне для чалавека. Спосабы здабычы карысных выкапняў. Карысныя выкапні, якія выкарыстоўваюцца ў будаўніцтве (пясок, гліна, граніт, вапнякі), іх знешні выгляд і ўласцівасці. Найбуйнейшыя радовішчы будаўнічага каменю, вапнякоў у Беларусі.

Гаручыя карысныя выкапні (торф, нафта, прыродны газ), іх знешні выгляд, уласцівасці, здабыча і выкарыстанне. Небяспека ўзгарання. Правілы бяспечнага абыходжання з газавай плітой. Найбуйнейшыя радовішчы гаручых карысных выкапняў у Беларусі.

Мінеральныя ўгнаенні. Калійныя солі, іх знешні выгляд, уласцівасці, спосабы здабычы, выкарыстанне. Правілы бяспечнага абыходжання з угнаеннямі. Каменная соль, яе знешні выгляд, уласцівасці, спосабы здабычы, выкарыстанне. Найбуйнейшыя радовішчы калійных і каменнай солей у Беларусі. Карысныя выкапні, з якіх атрымліваюць металы (рудныя). Беражлівыя адносіны да карысных выкапняў.

Практычная дзейнасць

Экскурсія ў краязнаўчы музей (аддзел «Карысныя выкапні»), да месцаў распрацоўкі або перапрацоўкі карысных выкапняў (па магчымасці).

Практычныя работы: вывучэнне знешняга выгляду, уласцівасцей узораў карысных выкапняў (пяску, гліны, граніту, вапнякоў, торфу, харчовай солі, руд).

Назіранні за здабычай і выкарыстаннем у будаўніцтве, побыце, сельскай гаспадарцы карысных выкапняў і прадуктаў іх перапрацоўкі.

Адпрацоўка спосабаў паслядоўнага абследавання вывучаемых аб’ектаў, вылучэнне іх прымет (якасцей, уласцівасцей); спосабаў распазнавання матэрыялаў, з якіх зроблены прадметы; даследаванне асобных уласцівасцей матэрыялаў, якія неабходна ўлічваць пры выкарыстанні прадмета па функцыянальным прызначэнні. Удзел у прыродаахоўнай дзейнасці па беражлівым выкарыстанні прыродных багаццяў, аднаўленні парушанай прыроды.

Адпрацоўка спосабаў штодзённага выкарыстання прадметаў са шкла, керамікі ў адпаведнасці з іх функцыянальным прызначэннем, з улікам іх уласцівасцей і якасцей.

Тлумачэнне спосабаў бяспечнага абыходжання са шклянымі, керамічнымі вырабамі, газавай плітой, гаручымі карыснымі выкапнямі і прадуктамі іх перапрацоўкі.

Металы і вырабы з іх (4 гадзіны)

Разнастайнасць металаў, іх роля ў жыцці чалавека. Паняцце аб сплавах. Металы чорныя (жалеза, чыгун, сталь) і каляровыя (медзь, алюміній). Прымяненне металаў і сплаваў з улікам іх уласцівасцей і якасцей.

Практычная дзейнасць

Практычныя работы: вывучэнне знешняга выгляду, уласцівасцей і якасцей узораў металаў, вырабаў з чорных і каляровых металаў, сплаваў. Назіранні за выкарыстаннем металаў і сплаваў у будаўніцтве, побыце, сельскай гаспадарцы.

Адпрацоўка спосабаў распазнавання металічных вырабаў, іх выкарыстання з улікам асаблівых уласцівасцей і якасцей; спосабаў і прыёмаў беражлівага і бяспечнага абыходжання з металічнымі вырабамі, аховы іх ад разбурэння (іржы).

Чалавек – частка прыроды і грамадства (2 гадзіны)

Прырода і людзі – адно цэлае. Дзейнасць чалавека ў прыродзе. Залежнасць здароўя чалавека ад стану навакольнага асяроддзя.

Ахова прыроды – абавязак кожнага чалавека.

Практычная дзейнасць

Назіранні за паводзінамі людзей падчас адпачынку ў прыродным асяроддзі; практычнай дзейнасцю людзей, накіраванай на ахову навакольнага асяроддзя. Аналіз прыкладаў станоўчага і адмоўнага ўздзеяння чалавека на прыроду. Складанне правіл прыродаахоўных паводзін.

## АДУКАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ «ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ» (5 гадзін)

Асабістая гігіена. Гігіена харчавання, адзення, абутку, памяшкання (2 гадзіны)

Асаблівасці гігіены хлопчыкаў і дзяўчынак. Залежнасць знешняга выгляду чалавека ад выканання правіл асабістай гігіены.

Прафілактыка харчовых атручванняў. Негатыўныя наступствы ўжывання сухой ежы, недаядання, пераядання.

Правілы догляду адзення і абутку. Значэнне чыстага адзення для здароўя чалавека. Комплекс дзеянняў, неабходных для забеспячэння чысціні ў памяшканнях. Негатыўныя наступствы антысанітарыі ў памяшканні.

Практычная дзейнасць

Ацэнка знешняга выгляду чалавека па фатаграфіях і ілюстрацыях. Складанне парад па выпраўленні памылак у знешнім выглядзе неахайнага чалавека і правіл вядзення здаровага ладу жыцця.

Прафілактыка захворванняў (3 гадзіны)

Клопат дзяржавы аб здароўі чалавека.

Прычыны і прыметы інфекцыйных захворванняў. Правілы паводзін падчас хваробы і прыёму лекавых прэпаратаў. Аптэчка, яе прызначэнне.

Абмарожванні, апёкі, іх прыметы, прычыны, першая дапамога. Прафілактыка траўматызму ў розныя поры года.

Практычная дзейнасць

Ацэнка стану ўласнага здароўя. Складанне расказу аб самаадчуванні (пры здаровым стане і падчас хваробы). Аналіз фактараў захворванняў і траўматызму. Складанне правіл прафілактыкі захворванняў і траўматызму. Камплектаванне аптэчкі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ VI КЛАСА

Вучні маюць уяўленні:

аб працы як аснове жыцця, разнастайнасці прафесій;

правілах адэкватных паводзін і зносін у розных жыццёвых сітуацыях; маўленчых этыкетных формулах;

асноўных старанах гарызонту;

розных спосабах арыентавання на мясцовасці;

асноўных кампанентах нежывой прыроды;

целах, рэчывах, часціцах;

кругавароце вады ў прыродзе;

саставе паветра, глебы, сонечнай сістэмы;

уласцівасцях вады, паветра, некаторых карысных выкапняў, глебы;

глебе, яе ролі ў прыродзе і значэнні для чалавека;

разнастайнасці карысных выкапняў, іх здабычы, выкарыстанні і ахове;

уплыве дзейнасці чалавека на прыроду;

адметных прыметах вывучаемых карысных выкапняў (2–3); найбольш распаўсюджаных металаў (2–3); прыродных з’яў (2–3);

неабходнасці выканання правіл, якія забяспечваюць бяспеку жыцця і здароўя ў сацыяльным і прыродным асяроддзі;

нашай Радзіме – Рэспубліцы Беларусь, яе памятных і славутых мясцінах, дзяржаўных сімвалах, духоўных і маральных рысах нацыі;

асаблівасцях гігіены хлопчыкаў і дзяўчынак;

прафілактыцы харчовых атручванняў, негатыўных наступствах ужывання сухой ежы, недаядання, пераядання;

негатыўных наступствах антысанітарыі ў памяшканні.

Уменні:

праяўляць павагу да вынікаў працы людзей;

праяўляць клопат аб захаванасці сваёй, школьнай маёмасці;

прытрымлівацца правіл бяспечных паводзін у сацыяльным і прыродным асяроддзі;

распазнаваць і называць аб’екты прыроды ў бліжэйшым асяроддзі, на малюнках (па вывучаемых тэмах);

характарызаваць вывучаемыя аб’екты па знешніх прыметах і ўласцівасцях;

прыводзіць прыклады аб’ектаў нежывой прыроды (паветра, вада, глеба);

апісваць вывучаемыя аб’екты, карыстаючыся нагляднымі ўзорамі;

выконваць практычныя заданні, карыстаючыся інструкцыйнай карткай;

удзельнічаць у доследах, якія праводзяцца настаўнікам;

праводзіць назіранні ў прыродзе;

прымяняць атрыманыя веды ў камунікатыўных сітуацыях у сацыяльным асяроддзі, пры выкананні практычных работ у прыродным асяроддзі;

апрацоўваць глебу на невялікіх плошчах пад кіраўніцтвам педагога;

вызначаць тэмпературу вады, паветра з дапамогай тэрмометраў;

даглядаць адзенне і абутак;

выконваць комплекс дзеянняў па забеспячэнні чысціні ў памяшканнях (выціраць пыл, падмятаць падлогу і іншае);

складаць прыкладны бюджэт сям’і (разлічваць даходы і расходы).

Вучні ведаюць і ўжываюць вучэбны матэрыял у розных відах дзейнасці:

выконваюць розныя віды практычнай дзейнасці па самаабслугоўванні, добраўпарадкаванні дома, класа, прышкольнай тэрыторыі;

арыентуюцца на мясцовасці;

праяўляюць уменні беражлівага абыходжання з прадметамі штодзённага выкарыстання;

адказна і эканомна расходуюць ваду.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

прадметныя веды і ўменні ў вучэбных і натуральных сітуацыях (дэманструюць стылі ветлівых зносін, прыдумваюць спосабы бяспечных паводзін пры неспрыяльных прыродных з’явах; ствараюць рэцэпты

прыгатавання страў; складаюць прагнозы надвор’я; замалёўваюць цікавыя віды сервіроўкі стала);

прадметныя веды і ўменні ў гульнях-драматызацыях, інсцэніроўках (выконваюць ролі прадаўца і пакупніка, урача і хворага; дэманструюць паказ моднага адзення; інсцэніруюць догляд хворага чалавека);

прадметныя веды і ўменні ў доследнай дзейнасці (дэманструюць доследы з вадой, паветрам, глебай).

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

праяўляюць станоўчыя адносіны і практычную гатоўнасць да працы;

дэманструюць адэкватныя формы сацыяльна прымальных паводзін у розных жыццёвых сітуацыях;

адрозніваюць этычныя паняцці і ўжываюць іх у практыцы зносін;

выконваюць жыццёва значныя прадуктыўныя дзеянні;

выкарыстоўваюць вербальныя і невербальныя сродкі зносін.